А. АНТАШУК
дырэктар
ДУК "Пінская раённая
цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма"

# "Запомніце мяне, якая я ёсць!"

## Да 70-годдзя з дня нараджэння Я. Янішчыц



**Кожны чалавек мае свае карані, сваю малую радзіму. Для Яўгеніі Іосіфаўны Янішчыц ёю з'яўляецца вёска Рудка Пінскага раёна, дзё яна нарадзілася 20 лістапада 1948 г.**

Праз некалькі гадоў бацькі пераехалі жыць у в. Велясніца. Ціхая беларуская вёска ў глыбі Палесся са сваёй свабодай, прасторавасцю і вялікай гістарычнай памяццю спадарожнічала развіццю таленту і самасвядомасці дзяўчыны. Ужо ў першых паэтычных спробах яна імкнецца выказаць сваё захапленне жыццём, сваю любоў да роднай зямлі, што дала ёй магчымасць радавацца, любавацца гэтым светам. Рудка, Велясніца, Мерчыцы, Парэчча… Гэта не проста вёскі на правым беразе прыгожай ракі з не менш прыгожай назвай — Ясельда. Гэта значна большае. Іх аб'ядноўвае не толькі рака, але і тое, што гэта родныя мясціны, малая радзіма знакамітай паэтэсы Я. Янішчыц.

Першы верш Жэні з'явіўся ў раённай газеце "Полесская правда", потым яна друкавалася ў сталічных выданнях, сярод якіх былі газеты "ЛіМ", "Заря", часопісы "Бярозка", "Маладосць". "Я — беларуская паэтка",— так гаварыла Яўгенія Янішчыц пра сябе і свае творы пісала на беларускай мове. Менавіта таму зборнік "Снежныя грамніцы", які быў выдадзены, калі яна вучылася на апошнім курсе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, і адкрываўся вершам "Радзіме". У назве "Снежныя грамніцы" тоіцца тонкае адчуванне цудоўных пераўтварэнняў свету і знойдзеная ёю, Жэняй Янішчыц, гарманічная ўзгодненасць з гэтым незвычайным светам. У дзень "грамніц" зіма сустракаецца з вясной, і здараецца, што ў небе прагрукоча гром. Тое ж пачынае адбывацца ў душы гераіні: яе таямніцы і загадкавыя перазовы імкнуцца знайсці вый-




сце і атрымаць другую якасць, другое напаўненне — у вершаваных радках. "Гром зімой! Калі яго ніхто не чакае! Гэтаксама нечакана, выклікаўшы здзіўленне, прагучала песня нашай паэтэсы: талент — заўсёды нечаканасць". Нечакана проста пісаліся вершы аб вечным, вялікім, значным, набываючы форму то прысягі, то лірычнай споведзі. У іх паэтэса звяртаецца да малой радзімы — месца свайго нараджэння:

*Прыедзь у край мой ціхі,*
*Тут продкаў галасы,*
*Тут белыя бусліхі*
*І мудрыя лясы...*

Янішчыц Я. Выбранае.— Мн., 2000.— с. 21.

Клопатам і ўвагай акружалі Я. Янішчыц пісьменнікі і паэты старэйшага пакалення Анатоль Вялюгін, Пімен Панчанка, Максім Танк, Ніл Гілевіч, Алег Лойка, Мікола Мятліцкі, Генрых Далідовіч... Лірыка паэтэсы была прадстаўлена ўсесаюзнаму чытачу, яе вершы публікавалі ў "Литературной газете", часопісах "Молодая гвардия" і "Дружба народов".

У 1974 г. выйшаў другі зборнік "Дзень вечаровы", а ў 1978-м ён быў адзначаны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі. Зборнік адкрывае новы этап у творчасці Я. Янішчыц. Яднанне дня і вечара ў назве нагадвае дзве прыступкі на лесвіцы часу: саступаючы з адной (дня), за якой вера ў шчаслівае наканаванне, паэтэса ўзнімаецца на другую (вечар), якая патрабуе разумення і больш глыбокага асэнсавання праяў свету і чалавека. У вершах прысутнічае філасофская разважлівасць, узнімаюцца адвечныя пытанні быцця. На змесце твораў зборніка пакінулі свой адбітак і два гады разлукі з радзімай, з Палессем, з маці і сынам.

Новае аблічча атрымала муза Яўгеніі Янішчыц у зборніку "Ясельда". Любімай тэмай і тут выступае роднае Палессе. Паэтэса звяртаецца да Палесся як да зямлі, што ўзгадавала фізічна, узнясла духоўна і дала талент. Душа вёскі — жыта, каласы, дарога — тыя звычайныя зямныя рэаліі, у якіх сабрана мудрасць стагоддзяў, адвечная праўда жыцця і на якіх трымаецца жыццяздольнасць многіх пакаленняў. Па-мастацку ўзнавіла Яўгенія Янішчыц у сваёй паэзіі лёсы аднавяскоўцаў, блізкіх, сярод якіх расла ў пасляваенны час, чые гора, пакуты і радасці перажыла чулым сэрцам, як уласныя. Нязменнымі захавала дзясяткі імёнаў: Анэтка, Арцём, Хведар, Ёзас, Раман, Сымон, Паланея, Марыя, Сава... І за кожным імем — характар, лёс. Часам лёс гэты звязаны з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Беларусь нельга ўявіць без горкай памяці вайны. Паэтэса не магла абыйсці ўвагай гэту тэму, бо рэха вайны жыло ў памяці і лёсах аднавяскоўцаў. Таму яна зноў і зноў вярталася да тых падзей.





Свайго сталага майстэрства Я. Янішчыц дасягнула ў кнігах "На беразе пляча", "Пара любові і жалю", за якую атрымала Дзяржаўную прэмію Беларусі імя Я. Купалы ў 1986 г., і "Каліна зімы". Роднасць з вясковым светам і змалку блізкім прыродным асяроддзем паэтызуецца ў многіх вершах.

Хоць у паэзіі Яўгеніі Янішчыц шмат аўтабіяграфічнага, таго, што звязана з роднымі мясцінамі, з вёскай, дзе заглыблены карані яе радаводу, аднак з яе твораў прадстае ўся Беларусь. Мы выразна адчуваем адметнасць менавіта беларускіх пейзажаў, нацыянальную своеадметнасць звычаяў, побыту нашага народа, яго гісторыі. Арганічна ўпісваюцца ў жыццяпіс беларусаў у паэме "Ясельда", вершах "Тата", "Мама", "Ля ложка хворай маці" лёсы бацькі і маці паэтэсы — нястомных працаўнікоў, захавальнікаў маральных запаветаў продкаў. Значнае месца ў творчасці паэтэсы займае лірыка кахання. Яўгенія Янішчыц у сваіх творах была гранічна шчырай, давала волю пачуццям, якімі жыла яе душа.

Апошнія гады жыцця Яўгеніі Янішчыц насычаны багатай, разнастайнай дзейнасцю: яна з'яўлялася загадчыкам аддзела паэзіі ў часопісе "Маладосць", актыўна выступала ў перыёдыцы са сваімі творамі. У апошняй прыжыццёвай кнізе "У шуме жытняга святла" сабрана лепшае з напісанага за 20 гадоў літаратурнай працы.

Звярталася Яўгенія Янішчыц і да прозы, напісала некалькі змястоўных апавяданняў сугучных з яе вершаванымі творамі пра народнае жыццё. Пэўнае месца ў творчасці паэтэсы займалі пераклады, артыкулы пра паэзію, змястоўныя рэцэнзіі на паэтычныя кнігі. Вершы яе перакладаліся на англійскую, балгарскую, нямецкую, польскую, рускую, украінскую мовы.

У кожнай мясцовасці ёсць паэты і пісьменнікі, якімі ганарацца іх нашчадкі. На Палессі такой была Яўгенія Янішчыц. З яе імем паядналіся багаты паэтычны дар, шчаслівы творчы лёс і глыбокая драма асабістага жыцця. На жаль, лёс адмераў ёй толькі сорак вёсен і зім. Але яна пакінула нам сваю цудоўную паэзію, якой суджана доўгае жыццё — пакуль будуць беларусы, пакуль будзе жыць беларускае слова. Палессе не забывае сваю слаўную дачку. Яе імя носіць Пінская цэнтральная раённая бібліятэка, адна з вуліц горада Пінска і вёскі Парэчча, Парэцкая базавая школа, дзе вучылася Яўгенія Янішчыц і дзе працуе музей. Яўгеніі Янішчыц паэты прысвячаюць вершы, у сельскіх бібліятэках і школах ладзяцца конкурсы.

І менавіта ў Год малой радзімы з мэтай азнаменавання 70-годдзя з дня нараджэння нашай знакамітай зямлячкі, актывізацыі дзейнасці бібліятэк па папулярызацыі творчай спадчыны паэтэсы, прывіцця любові да роднай мовы і культуры сярод бібліятэк быў праведзены раённы агляд-конкурс на лепшае тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц "На голас музы...".

Журы адзначыла разнастайнасць увасобленых ідэй, высокае выканаўчае майстэрства і артыстызм усіх удзельнікаў конкурсу. Прыемна адзначыць, што ўсе бібліятэкары падыйшлі да распрацоўкі і падрыхтоўкі тэатралізаваных прадстаўленняў граматна, творча і з арыгінальнай выдумкай. Журы цяжка было вызначыць пераможцаў, бо ўсе ўдзельнікі агляду-конкурсу прадставілі сваё творчае майстэрства на высокім мастацкім, эстэтычным і інфармацыйным узроўні.

У рамках агляду-конкурсу бібліятэкары раёна ахапілі амаль усю паэтычную спадчыну нашай зямлячкі. Гучалі вершы — "Прыедзь у край мой ціхі", "Палессе", "Вёсцы", "Люблю, калі сыдуць марозы", "Старана мая азёрная", "У калыханку сыну", "Ля ложка хворай маці", "Пралескі", "Ты пакліч мяне. Пазаві", "Застаюся каханай!", урывак з паэмы "Ягадны хутар".

Лепшымі былі прызнаны тэатралізаваныя прадстаўленні вершаў Дамашыцкай, Кашавіцкай, Стытычаўскай, Парахонскай, Пінкавіцкай, Плешчыцкай, Садоўскай, Валішчанскай сельскіх бібліятэк і Лагішынскай гарпасялковай бібліятэкі.

Пераможцам агляду-конкурсу аднагалосна прызнана Бабрыкоўская сельская бібліятэка, якая прадставіла вершы Яўгеніі Янішчыц "Мама" і "Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён". Дыпломам другой ступені адзначана Навадворская сельская бібліятэка за тэатралізацыю верша "Я вас люблю" ў выкананні вучаніцы 10 класа Чухаўскай сярэдняй школы Нарывончык Лізаветы. Дыпломам трэцяй ступені ўзнагароджаны аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Я. Янішчыц за тэатралізацыю верша "У калыханку сыну".

На Піншчыне бібліятэкі адзначаюць юбілейныя гады актывізацыяй увагі да жыцця і творчасці Яўгеніі Янішчыц. Асаблівым з'яўляецца 2018 год, на працягу якога праводзяцца вечары паэзіі, выступленні ЛПГ, конкурсы чытальнікаў. На сайце цэнтральнай раённай бібліятэкі размешчана база даных "Я. Янішчыц". У Год малой радзімы ў лістападзе стартуе месячнік "Янішчынскі лістапад" і адбудзецца раённае свята паэзіі "Непрыручаная птушка Палесся".

"Запомніце мяне, якая я ёсць!" — радок з верша Яўгеніі Янішчыц. Яна была і застаецца ў айчыннай паэзіі зоркай першай велічыні.